Спорт-тайм

# Фінішавалі першыя, але са штрафам

**У традыцыйным спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра здарэнне на «Дакары», першы ў сезоне турнір «Вялікага шлема», выступленне «Мінчанкі» ў расійскай суперлізе і мінскага «Дынама» ў КХЛ.**

1. ***Адзінаццатая ракетка планеты Арына Сабаленка ў першым крузе адкрытага чэмпіянату Аўстраліі перамагла расіянку Ганну Калінскую — 6:1, 6:4.*** У другім крузе Сабаленка будзе сапернічаць з брытанкай Кэці Бултэр. Вера Лапко (62-і нумар рэйтынга WTA) завяршыла выступленне ў Аўстраліі, саступіўшы ў стартавым паядынку шведцы Юхане Ларсан на тай-брэйку — 6:7 (5:7). У другой партыі пры ліку 3:0 на карысць сапернiцы Вера Лапко не змагла працягнуць гульню і знялася з турніру. Вікторыя Азаранка згуляе сёння з нямецкай тэнісісткай Лаурай Зігемунд.

2. ***Валейбалісткі «Мінчанкі» дамагліся трэцяй перамогі ў расійскай суперлізе, абыграўшы ў гасцях саратаўскі «Пратон» у пяці партыях — 3:2.*** Найбольш выніковымі гульцамі матча ў «Мінчанкі» сталі Кацярына Сакольчык (20 ачкоў) і Дар'я Валадзько (13 ачкоў).

У актыве беларускай каманды 10 ачкоў і дзясятае месца ў турнірнай табліцы чэмпіянату. Чарговы матч у расійскай суперлізе «Мінчанка» правядзе 20 студзеня на выездзе з «Сахалінам».



3. ***Хакеісты «Гомеля» пацярпелі тры паражэнні ў суперфінале Кантынентальнага кубка і занялі чацвёртае месца на турніры ў Белфасце (Паўночная Ірландыя).*** У трэцім туры беларуская каманда саступіла польскаму клубу «ГКС Катавіцы» — 0:5. Раней гамяльчане прайгралі «Белфаст Джаянтс» (0:5) і казахстанскаму «Арлану» (2:8).

Кантынентальны кубак 2019 года заваявалі хакеісты «Арлана», якія ў серыі булітаў былі мацнейшыя за «Белфаст» з лікам 3:2.

Нагадаем, летась уладальнікам ганаровага трафея стала мінскае «Юнацтва». Для каманды Міхаіла Захарава гэта быў трэці падобны поспех пасля перамог у 2007 і 2011 гадах. У 2015 годзе Кантынентальны кубак выйграў гродзенскі «Нёман».

4. ***Хакеісты «Дынама-Мінск» у гасцях пацярпелі паражэнне ад лідара чэмпіянату КХЛ маскоўскага ЦСКА з лікам 0:3.*** Нагадаем, у бягучым чэмпіянаце каманды сустракаліся 6 студзеня ў Мінску і ЦСКА дамогся перамогі — 2:1.



Чарговы матч чэмпіянату КХЛ «Дынама-Мінск» правядзе сёння з падмаскоўным «Віцязем». Пасля гэтага падапечныя Андрэя Сідарэнкі адправяцца на выезд у Санкт-Пецярбург, Рыгу і Браціславу.

5. ***Экіпаж пілота каманды «МАЗ-СПОРТаўта» Сяргея Вязовіча прыйшоў першы на шостым этапе ралі-рэйду «Дакар-2019», але з-за штрафу аказаўся на пятым месцы.*** «Можна было б быць задаволеным вынікам, але ёсць адно «але» — на адным з бакавых спускаў мы не ўтрымалі грузавік на трэку і прыйшлося спусціцца ўніз. Наверсе застаўся адзін з пунктаў. 20 хвілін мы спрабавалі вярнуцца, бо вельмі высока. Па рэгламенце нам дадуць час штрафу, таму тут рана радавацца перамозе на спецучастку», — адзначыў Сяргей Вязовіч.

Па інфармацыі афіцыйнага сайта «Дакара», на першым месцы па суме шостага этапу знаходзіцца экіпаж галандца Жэрара дэ Роя на «Івека», на другім — аргенцінец Федэрыка Вілагра, на трэцім — прадстаўнік каманды «КамАЗ-Майстар» расіянін Дзмітрый Сотнікаў.

Ралі-рэйд «Дакар-2019» праходзіць па тэрыторыі Перу і завершыцца 17 студзеня ў Ліме. Гоншчыкам трэба будзе праехаць каля 5 тыс. км. Больш за палову маршруту пралягае цераз пясчаныя трасы з вялізнымі дзюнамі і іншымі перашкодамі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.20 | 17.18 | 7.58 |
| Віцебск — | 9.16 | 17.01 | 7.45 |
| Магілёў — | 9.10 | 17.08 | 7.58 |
| Гомель — | 8.59 | 17.12 | 8.13 |
| Гродна — | 9.39 | 17.35 | 7.56 |
| Брэст — | 9.28 | 17.43 | 8.15 |

## Месяц

*Першая квадра 14 студзеня.*

*Месяц у сузор'і Цяльца.*

## Імяніны

***Пр.** Серафімы, Сільвестра, Ульяны.*
***К.** Арнольда, Ізыдара, Макара, Паўла.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




# Даты Падзеі Людзі

**15 СТУДЗЕНЯ**




**1909** год — нарадзіўся (вёска Колышкі, цяпер у Лёзненскім раёне) Яфім Майсеевіч Фамін, адзін з кіраўнікоў абароны Брэсцкай крэпасці. З красавіка 1941 года намеснік камандзіра па палітычнай частцы 84-га стралковага палка на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці. 22 чэрвеня 1941 года арганізаваў і ўзначаліў абарону каля Холмскіх варот цытадэлі, з 24 чэрвеня — намеснік камандзіра зводнай баявой групы абаронцаў крэпасці. Цяжка паранены Фамін трапіў у палон і расстраляны гітлераўцамі.



**1934** год — нарадзіўся (г. Клецк) Якуб Мустафавіч Александровіч, беларускі вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па праблемах прагназавання сацыяльна-эканамічнага развіцця, інтэнсіфікацыі нацыянальнай эканомікі. Ажыццяўляў навукова-метадычнае кіраўніцтва і ўдзельнічаў у распрацоўцы найважнейшых рэспубліканскіх эканамічных праграм. Аўтар больш як 130 навуковых прац, у тым ліку чатырох манаграфій.

**1959** год — прайшоў усесаюзны перапіс насельніцтва: у Беларусі налічвалася 8 054 648 чалавек; а паводле перапісу насельніцтва 1970 года ў рэспубліцы пражывала 9 002 300 чалавек.




**1795** год — нарадзіўся (г. Масква) Аляксандр Сяргеевіч Грыбаедаў, рускі пісьменнік, дыпламат. У 1813—1816 гадах служыў у Кобрыне, Брэсце. З 1817-га на службе ў Калегіі замежных спраў, у 1818—1822-м — сакратар рускай дыпламатычнай місіі ў Персіі, паўнамоцны пасол Расіі ў Персіі. Аўтар камедый «Студэнт», «Гора ад розуму» і інш. У Гомельскім абласным краязнаўчым музеі захоўваецца ўнікальны варыянт камедыі «Гора ад розуму» (належаў графу І. Паскевічу). На беларускую мову камедыю пераклаў М. Лужанін. Забіты ў Тэгеране ў 1829 годзе.

**1850** год — нарадзілася Соф'я Васільеўна Кавалеўская, знакаміты матэматык. Першая ў свеце жанчына-прафесар, першая жанчына — член-карэспандэнт Пецярбургскай акадэміі навук. Вырасла ў Віцебскай губерні ў маёнтку свайго бацькі — генерала Корвін-Крукоўскага, прадстаўніка беларускай шляхты. Асноўныя навуковыя працы прысвечаны матэматычнаму аналізу, механіцы і астраноміі. Аўтар рамана «Нігілістка» і мемуараў «Успаміны дзяцінства». Памерла ў Швецыі ў 1891 годзе.

**1929** год — нарадзіўся Марцін Лютэр Кінг, адзін з кіраўнікоў руху за грамадзянскія правы чарнаскурых амерыканцаў, ініцыятар тактыкі негвалтоўных дзеянняў, лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру (1964). Памёр у 1968 годзе.

**1934** год — французскія фізікі Ірэн і Фрэдэрык Жаліо-Кюры прадставілі ў Парыжскую акадэмію навук паведамленне аб адкрыцці з'явы штучнай радыеактыўнасці, якая мела надзвычай важнае значэнне для ядзернай фізікі.

# УСМІХНЕМСЯ

**Фірма запрашае дасведчаных гультаёў для работы ў канкурэнтнай арганізацыі.**

Мужчына забірае машыну са стаянкі і паказвае драпіну ахоўніку:

— Гэта, што, «так было»?

— Не, гэта так будзе.

**У аптэчцы «БелАЗа» на амбулаторным лячэнні могуць знаходзіцца да шасці чалавек.**

У сталовай:

— Што ж хлябок не бераце?

— Дзякуй, я ўжо ўзяў катлеты!

**Карысная парада для вулічных баёк: чхні на свой кулак, каб наносіць дадатковы ўрон атрутай.**

Цікавае назіранне: у 9 з 10 піратаў аднаго вока няма з боку пляча, на якім сядзіць папугай.


Родную, любую **Валянціну Іванаўну ЛЯЎШУ** — цудоўнага доктара і прыгожай душы чалавека з г. п. Любча — шчыра віншуем з днём нараджэння!

*Зычым годна ды шчасліва*
*ўсё жыццё сваё пражыць!*
*І людзям — хворым і здаровым —*
*цяпло душы сваёй дарыць!*

**З удзячнасцю твая сям'я: сястра, сыны, нявесткі, унукі.**



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 138.

Нумар падпісаны ў 19.30 14 студзеня 2019 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12